# ГАЛОЎНЫЯ СПЕВЫ

## Трапар, спеў 8

па-царкоўнаславянску

Покаяния отверзи ми двери Жизнодавче, / утренюет бо дух мой ко храму святому Твоему, / храм носяй телесный весь осквернен: / но яко щедр, очисти / благоутробною Твоею милостию.

па-беларуску

Пакаяння дзверы адчыні мне, Жыццядацелю: / дух мой імкнецца да святыні Тваёй; / святыня ж цела майго ўся апаганеная, / але Ты, Добры, ачысці мяне / ў вялікай міласэрнасці Тваёй.

## Кандак, спеў 4

па-царкоўнаславянску

Фарисеева убежим высокоглаголания, / и мытареве научимся высоте глагол смиренных, / покаянием взывающе: / Спасе мира, / очисти рабы Твоя.

па-беларуску

Сцеражомся ганарлівай пахвальбы фарысея / і навучымся ад мытніка вышыні словаў пакорлівых; / усклікнем у каянні: / Збавіцелю свету, / будзь спагадлівы да слугаў Тваіх!


**З блаславення настаяцеля Свята-Міхайлаўскага прыхода**
**протаіерэя Ігара Галакава**
***Падрыхтаваў Алесь Спіцын***
**Дата выпуску: 17 лютага 2019 г.**





# МІХАЙЛАЎСКІ ЛІСТОК

ЛЮТЫ, 2019

Свята-Міхайлаўскі прыход г. Мінска, вул. Янкоўскага, 2


# НЯДЗЕЛЯ МЫТНІКА І ФАРЫСЕЯ



## Дарагія браты і сёстры!

У гэтую нядзелю мы, разам з усёй Праваслаўнай царквой, працягваем падрыхтоўку да Вялікага посту, які мусіць стаць для кожнага перыядам значнага пакаяльнага подзвігу. І вось цяпер, паводле звычая нашых святых айцоў, мы чытаем урывак з Евангелля, у якім прыводзіцца прыпавесць нашага Настаўніка і Госпада Ісуса Хрыста, дзе Ён распавядае пра дзве якасці малітвы, пра два кшталты малітоўнага настрою, што праяўляецца ў розных людзей.

Паводле сюжэту прыпавесці ў храм увайшлі памаліцца два чалавекі. Адзін з іх фарысей (ад габрэйскага *"пурушым"* – *"чыстыя"*), а другі мытнік (зборшчык падаткаў для рымскай улады). Гэта не была агульная храмавая малітва. Кожны герой прыпавесці маліўся сам у сабе, перад Богам. Пры гэтым Гасподзь Ісус Хрыстос кажа, што мытнік пайшоў дамоў больш апраўданы, чым фарысей.

Тут неабходна нагадаць, што фарысеі адрозніваліся вернасцю Богу і Ягонаму закону, строгім ладам жыцця, пільным вывучэннем і выкананнем запаведзяў Госпаду, паданнем міласціны, адным словам, былі глыбока рэлігійнымі людзьмі. Мытнікі ж у сваёй большасці наадварот былі людзьмі надзвычай свецкімі, раўнадушнымі да чужых пакутаў, не цураліся гвалту й прымусу, бо толькі так яны маглі выконваць сваю жорсткую працу. У тагачасным юдэйскім грамадстве да мытнікаў ставіліся як да людзей цалкам страчаных для веры і Божага народа, не вартых збавення. Такім чынам, калі Гасподзь кажа, што мытнік пайшоў дамоў больш апраўданы чым фарысей, Ён выклікае слухачоў на сур’ёзны роздум.

Што ж было "не так" у малітве фарысея? Што, нягледзячы на ўсе яго намаганні, паставіла яго ніжэй за духоўна слабейшага мытніка? Мытнік стаяў у сваёй малітве перад Усявышнім адзін, сам-насам, з усімі сваімі грахамі ды немачамі, "зачыніўшы за сабой дзверы" сваёй сардэчнай горніцы. Фарысей жа "прывёў" у асабістую малітву іншых людзей. Толькі прывёў ён іх туды не як братоў, за якіх ён хацеў бы хадайнічаць, і нават не як ворагаў ад якіх прасіў бы абароны, а прывёў ён іх туды як нікчэмных стварэнняў ніжэйшай прыроды, вартых зласлоўя. "Я не такі, як астатнія людзі і як гэты мытнік" – вось словы, з якімі фарысей прыводзіць іншых людзей перад аблічча Божае. Яны атрымліваюць эпітэты "рабаўнікоў", "крыўдзіцеляў" і "чужаложцаў". Такі вось хуткі суд здзяйсняецца ў гэтай малітве.

І, на жаль, дарагія браты і сёстры, гэткі ж хуткі суд здзяйсняецца і ў нас, калі мы занятыя легкадумнасцю й пустымі размовамі. Страшны, страшны грэх зласлоўя. І тым страшнейшы, што амаль што не заўважны і ўласцівы многім і многім прыстойным хрысціянам, якія "не крадуць", "не забіваюць" і спраўна наведваюць храм. І так часта мы апраўдваем сваё зласлоўе добрымі на выгляд прычынамі, хаця насамрэч у аснове яго няма нічога, апроч грахоўнай страсці.

Дарагія браты і сёстры! У зусім недалёкім будучым мы ўступім на попрышча Вялікага посту. Пастараемся ж пазбавіцца ад зласлоўя, перасудаў і пляткарства. Будзем памятаць, словы Госпада аб тым, што малітва грэшніка, які ўсведамляе свае грахі, больш заўгодная Богу, чым малітва праведнага ў сваіх учынках чалавека, які пры тым пагарджае іншымі і зласловіць людзей, хай сабе й слабейшых за яго духоўна.